Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# На гульнёвую пляцоўку
(канспект экскурсіі)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Узрост дзяцей: 4-6 гадоў;

Тып маршруту: пешы

Працягласць па часе: 1г.

Адлегласць: 100 м.

Маршрут: дзіцячы сад – гульнёвая пляцоўка – дзіцячы сад;

Мэта: замацаваць уменні называць, адрозніваць, паказваць розныя збудаванні на дзіцячай гульнёвай пляцоўцы, замацаваць уменне гуляць у калектыве.

Папярэдняя работа: гутарка аб гульнях на дзіцячай пляцоўцы (каруселі, горкі, арэлі, пясочніцы); разглядванне ілюстрацый.

ХОД ЭКСКУРСІІ

Выхавальнік: Дзеці, я прапаную правесці экскурсію па нашым аграгарадку, дзе знаходзіцца наш дзіцячы сад. Згодны?

Дзеці: Так!

Выхавальнік: Скажыце, якія збудаванні знаходзяцца ў нашым аграгарадку?

Дзеці: Дамы, школа, дзіцячы сад, крамы, пошта, фізкультурна – аздараўленчы комплекс, дом культуры.

Выхавальнік: Дзеці, а што яшчэ мы з вамі не назвалі?

Дзеці: Гульнёвая пляцоўка.

Выхавальнік: Так.

Выхавальнік: Скажыце, што знаходзіцца на дзіцячай гульнёвай пляцоўцы?

Дзеці: Каруселі, арэлі, горкі, пясочніца.

Выхавальнік: А вы хочаце пайсці на гульнёвую пляцоўку?

Дзеці: Так!

Выхавальнік: Перш, чым адправіцца, трэба ўспомніць правілы паводзін.

Правілы паводзін:

Разбіваемся на пары і рухаемся парамі сябар за сябрам;

Падчас шляху ніхто не адстае і не бяжыць наперад накіроўваючага;

На гульнёвай пляцоўцы ўважліва слухайце выхаваделя і кіраўніка фізічнага выхавання;

Дзіцячая пляцоўка.

Кіраўнік фізічнага выхавання расказвае дзецям аб тым, што здароўе - найважнейшая перадумова правільнага фарміравання дзіцячага характару, развіцця волі, прыродных здольнасцей.

Кіраўнік фізічнага выхавання: Што значыць быць здаровым?

Дзеці: (адказы дзяцей).

Кіраўнік фізічнага выхавання: Дзе людзі могуць займацца спортам?

Дзеці: (адказы дзяцей).

Кіраўнік фізічнага выхавання расказвае аб прызначэнні спартыўных зон гульнёвай пляцоўкі: бегавая дарожка, турнікі, каруселі, арэлі, горкі, пясочніца.

Размінка на турніках: (вісы, уздым прамых ног, лажанне, падцягванне)

Вольная дзейнасць дзяцей на гульнёвай пляцоўцы.

Кіраўнік фізічнага выхавання адзначае своеасаблівасць канструкцый, звяртаю ўвагу на афармленне каруселей, разнастайнасць горак і г.д.

Выхавальнік: Дзеці, вам падабаецца гульнёвая пляцоўка? Мне яна вельмі падабаецца.

Дзеці: І нам таксама.

Выхавальнік: А чым яна вам падабаецца?

Выхавальнік: Сапраўды, пляцоўка вельмі цікавая. Вы хацелі б яшчэ раз прыйсці сюды?

Пасля экскурсіі дзеці малююць тое, што ім запомнілася, складаюць аповяд.